ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
6 07 2017 г.

SEX=БАЛЯСЫ

# ГЛЫБІНЯ ПРЫЦЯЖЭННЯ

**...Усё адбылося дакладна як у анекдоце. («Люблю ў летні час саступаць у грамадскім транспарце месцы дзяўчатам. А самому стаяць побач...») У вагоне метро хлопец насупраць ветліва, але настойліва прапанаваў маладой паненцы, што спынілася перад ім, прысесці. Тая, крыху павагаўшыся, пагадзілася. І тут перада мной у прамым сэнсе адкрылася прычына той настойлівасці хлопца і пэўнай нерашучасці дзяўчыны. («У заапарку дзяўчына ў леапардавых легінсах, якая хутка ішла па тэрыторыі, распужала статак казуль».) Трэба сказаць, што на пасажырцы была сукенка з цесным ліфам і глыбокім дэкальтэ... Ну, вы здагадаліся, што адкрылася маім вачам, не кажучы ўжо пра таго хлопца, што саступіў месца. («Хлопчыкі любяць дзяўчынак, якія ведаюць, што любяць хлопчыкі».) Я гэта да чаго хілю? Каб прыцягнуць да сябе ўвагу, прадстаўніцам прыгожага полу нярэдка і рабіць, як у гэтым выпадку, асабліва нічога не даводзіцца.**

...Гэта толькі ў вядомай песні мастак «прадаў свой дом, прадаў карціны і прыстанак і на ўсе грошы купіў цэлае мора кветак». У Кітаі ж жанчына набыла дом, прадаўшы 20 iPhone7, якія ёй падарылі яе прыхільнікі. («— Дарагі, купі мне новы тэлефон. — А як жа той, другі, які ў цябе ёсць? — Ну... Той другі купіць мне футра».) Чулі пра гэту гісторыю? У Паднябеснай, як вядома, больш мужчын, таму нявест там — вялікі дэфіцыт. Верагодна, менавіта гэтая акалічнасць дазволіла маладой кітаянцы сустракацца адначасова... з 20 хлопцамі. Падазраю, што тэма прыгажосці ў гэтым выпадку нават не паўставала, дастаткова было аднаго толькі факта наяўнасці патэнцыяльнай жонкі. («Чалябінскія нявесты настолькі крутыя, што ў канцы вяселля кідаюць праз сябе сяброўкам не букет, а нежанатага мужыка».) Чаму не скарыстацца такой сітуацыяй і ў больш глабальным сэнсе, відавочна падумала кітаянка? («Жанчынай быць прасцей. Пакапрызіла трошкі, закаціла істэрыку са слязьмі — і ў цябе ёсць усё, што трэба. Мужчынам быць складаней. Пакапрызіў крыху — і ў цябе нават есці няма чаго».) Прадпрымальная дзяўчына папрасіла кожнага з кавалераў падарыць ёй новенькі iPhone. І ніхто з хлопцаў не адмовіў! А ты паспрабуй! («Не пішаш? Ганарлівы? Ну і не пішы, у мяне такіх як ты, сотня... — сказала дзяўчынка фламастару».) Атрымаўшы ў падарунак смартфоны апошняй мадэлі, кітаянка прадала іх, а на выручаныя грошы набыла дом у сельскай мясцовасці. («З разынкай павінны быць кексы. З загадкай — сканворды. А вось жанчына павінна быць з мазгамі».)

> **«Ідэальная жонка павінна выглядаць так, каб усе думалі, што яна палюбоўніца».**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Праўда, часам гэтая прыродная жаночая прыцягальнасць можа сыграць з прадстаўніцамі прыгожага полу злы жарт. («Люся так хутка бегла ад маньяка, што на другім крузе дагнала яго і напала ззаду».) У Тайландзе медсястры прыватнага шпіталя, аматарцы абцягваючых кароткіх халацікаў і пікантных фота на рабочым месцы, давялося сысці з працы пасля масавых абвінавачванняў у непавазе да свяшчэннай прафесіі медыка. Здымкі ў сацыяльных сетках сталі віруснымі, дзякуючы чаму дзяўчына набыла вялікую папулярнасць у сеціве. Але кансерватыўныя тайцы палічылі касцюмы медсястры занадта правакацыйнымі. («— Ты павінен прымаць мяне такой, якая я ёсць. — Добра, прыём скончаны!») Пасля скандалу дзяўчына прынесла свае прабачэнні Савету медсясцёр і акушэрак Тайланда, але ёй гэта не дапамагло. («Калі табе дзесьці не рады ў рваных шкарпэтках, дык і ў цэлых туды ісці не варта».)

А бывае, увогуле даходзіць да абсурду. У Камбоджы міністр культуры забараніў здымацца ў кіно 24-гадовай актрысе з-за таго, што палічыў яе адзенне занадта... эратычным. («Усё нармальна. Проста нормы мяняюцца».) Гэтая падзея не пакінула раўнадушнымі прыхільнікаў таленту (ці знешнасці?) дзяўчыны, якія выступілі з пратэстам супраць рашэння міністра. («Бора, запомні! Як ты сябе з жанчынай паставіш, так яна цябе з сабой і пакладзе».) Актрыса заявіла, што ў далейшым будзе імкнуцца паводзіць сябе больш сціпла, аднак не мае намеру следаваць чыімсьці парадам, як ёй трэба апранацца. («Яна хацела выкінуцца з акна. Але потым успомніла, што прыстойныя дзяўчаты на дарозе не валяюцца, і вырашыла абмежавацца істэрыкай».)

Але што нам да далёкага замежжа, калі і ў бліжнім «глыбіня прыцяжэння» зашкальвае! Нядаўні Маскоўскі кінафестываль прэса ахрысціла не інакш, як... бітвай дэкальтэ. На ім спявачкі і актрысы спаборнічалі ў намінацыі «максімальна шырокае і глыбокае». Але што я вам гавару, гэта бачыць трэба... («Ідэальная жонка павінна выглядаць так, каб усе думалі, што яна палюбоўніца».)

...Словам, па жыцці атрымліваецца, як у савецкай кінакамедыі «Дзяўчаты»: «Ух, гэтыя Анфіскі!» Тая дзяўчына з метро цішком кідала на ўласны бюст позірк ці не часцей, чым хлопец побач, відавочна ўсведамляючы магутнасць і дзейснасць зброі. («Нават самому моцнаму мужыку лёгка звярнуць галаву грудзямі пятага памеру».) І твар не свяціўся. (Усё з той жа камедыі: «Вось іду я, прыгожая, па вуліцы, а ўсе сустрэчныя хлопцы так і слупянеюць, а каторыя паслабей — дык і падаюць, падаюць, падаюць і самі сабой у штабялі ўкладваюцца!») А ўсё чаму, здагадваецеся? Бо прыцяжэнне — узаемнае! «У мяне з дзяўчынай ідэальныя адносіны. Я яе цалкам кантралюю, а яна мной маніпулюе».

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Вярнуўся да музыкі праз здымкі кліпаў»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*




***— Як цябе праводзілі на «Еўрабачанне» твае сябры і аднакласнікі?***

— Я практычна не быў у школе напярэдадні конкурсу, амаль не гуляў на вуліцы з сябрамі. З верасня па снежань ішла актыўная падрыхтоўка. Таму памятаю толькі, як усе сябры, аднакласнікі, родныя і не толькі сустракалі ў аэрапорце, калі я ўжо прыляцеў з перамогай.

***— Песню ты напісаў сабе сам?***

— Так, гэта адна з умоў конкурсу. У песні «З сябрамі» вельмі простыя, наіўныя словы. Канешне, дзецям дапамагаюць дарослыя. Аранжыроўку, напрыклад, зрабіў кампазітар Яўген Алейнік.

Пасля гэтага песні больш не ствараў. А цяпер пішу сцэнарыі для кліпаў і кіно.

> **«Напэўна, самая глабальная мэта ў прафесійным плане — зняць свой поўнаметражны фільм».**

***— Як зразумеў, што музыка не твае і ты хочаш здымаць відэа?***

— Прайшоў час пасля перамогі ў конкурсе, і я ўсвядоміў, што трэба развівацца. Захапіўся здымкамі і мантажом. Да музыкі проста ўжо не адчуваў цягі. У 15 гадоў пайшоў у кінашколу і там атрымаў базавыя веды. Пачаў здымаць канцэрты, канферэнцыі, потым — кароткаметражнае кіно. Але пасля таго, як паспрабаваў сябе ў музычных кліпах, зразумеў: гэта маё. Іншымі словамі, да музыкі я вярнуўся, але праз іншы ўваход.

У відэа ты сам ствараеш прадукт цалкам, а ў музыцы часцей за ўсё ты пасярэднік паміж кампазітарам і гледачом.

***— Над чыімі кліпамі працуеш?***

— Я супрацоўнічаў спачатку з сябрамі і добрымі знаёмымі. Здымаў кліпы для Кірыла Ермакова, Волі Сацюк, Зіны Купрыяновіч. Зараз выходжу на новы ўзровень. Працую не толькі ў Беларусі. Вось, напрыклад, зусім нядаўна здымаў кліп для расійскага гурта «Лаві». Мне падабаецца рабіць з кліпа міні-гісторыю, каб ён быў падобны на невялікі фільм.

***— Ты выпускаешся з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. З чым звязаная твая дыпломная работа?***

— Здымаў кароткаметражны дакументальны фільм-партрэт пра мастака. Я ведаю яго даўно, у яго вельмі цікавая гісторыя. Прыкладна да 19 гадоў ён нічым не займаўся. А потым у яго здарылася клінічная смерць, і ён пачаў маляваць. Тры дні я фактычна жыў з ім: назіраў за тым, як ён малюе, вывучаў яго асяродак.

***— Хто цябе падтрымлівае ва ўсіх тваіх праектах і пачынаннях?***

— З самага дзяцінства гэта робяць мае бацькі. Дзе б я сябе ні выпрабоўваў, яны заўсёды мяне падтрымлівалі і стараліся ўсяляк мне дапамагчы. А ўжо на працягу апошніх пяці гадоў мяне падтрымлівае каханая дзяўчына, з якой мы хутка створым сям'ю. Апошнія мае дасягненні здзейсніліся дзякуючы ёй.

***— Што б ты яшчэ хацеў зняць? Мабыць, ёсць нейкія рэжысёрскія мары?***

— Напэўна, самая глабальная мэта ў прафесійным плане — зняць свой поўнаметражны фільм.

***— Якую музыку слухаеш?***

— The Weeknd, Bruno Mars, часам — Kanye West і Drake. Лічу, што гэта музыка нашага пакалення.

Але, шчыра кажучы, я мала слухаю музыку, асабліва ў навушніках. Люблю кампазіцыі «глядзець». Напрыклад, кліпы на YouTube. Так я чэрпаю натхненне для работ.

***— Чыімі рэжысёрскімі работамі захапляешся? На каго хацеў бы раўняцца?***

— Ёсць адзіны творца (я не ведаю, як ён працуе і як ён гэта робіць), якім я па-сапраўднаму захапляюся як чалавекам і як прафесіяналам. Гэта Алан Бадоеў. Ён проста зачароўвае сваёй думкай. З замежных — гэта Director X, Джозэф Кан. Але яны, хутчэй, здзіўляюць маштабамі здымак. Калі кожны кліп — як асобны фільм. Нават некаторае кіно цябе іншы раз не так чапляе, а тут за тры кароткія хвіліны ты перажываеш буру эмоцый.

З кінарэжысёраў падабаюцца Дэвід Фінчэр, Гай Рычы, Марцін Скарсэзэ, Алехандра Гансалес Іньярыту — рэжысёр фільма «Выжылы» з Леанарда Дзі Капрыа.

***— Кантактуеш зараз з кім-небудзь з «дзяцей «Еўрабачання»?***

— Камунікую з Воляй Сацюк. З ёй мы знялі не адну работу. З Андрэем Кунцом сустракаліся на падрыхтоўчых курсах рэжысёраў экраннага мастацтва. З Ксюшай Сітнік менш кантактую, яна цяпер не ў Беларусі.

***— Ці глядзіш цяпер «Еўрабачанне»? Што трэба зрабіць Беларусі, каб перамагчы на дарослым конкурсе?***



— Так, гляджу. Але, калі шчыра, не ведаю рэцэпта перамогі. Я лічу, што немагчыма ведаць наперад, што спадабаецца публіцы і журы. Мне шкада тых выканаўцаў, якім сапраўды патрэбная сцэна. Яны рыхтуюцца, прабіваюцца наперад у нацыянальных адборах сваіх краін, а перамога дастаецца не ім. Не думаю, што гэта конкурс прафесіяналаў, хутчэй гэта шоу. А вось у дзіцячым «Еўрабачанні» больш цэняцца не нумар і шоу, а вакал і прафесіяналізм.

***— Паехаў бы цяпер на конкурс, калі б прапанавалі?***

— Шчыра кажучы, не. Я люблю ўдзельнічаць у конкурсах, дзе дакладна разумею, што трэба для перамогі. А дарослае «Еўрабачанне» для мяне ў гэтым плане загадка. Да таго ж, немагчыма проста паехаць на гэты конкурс. Гэта пэўны лад жыцця, гэтай мэтай трэба «гарэць». А я знайшоў сябе ў іншым.

**Ганна БАГІНО.**

*bahino@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 05.07.2017 г.